## Літаратура

1. *Александрова, О. И.* Окказиональные безаффиксные существительные женского рода в поэтических произведениях начала XX века: краткий анализ и материалы для словаря / О. И. Александрова // Ученые записки Арзам. пед. ин-та. – Горький, 1969. – Вып. 95. – С. 93–227.
2. *Алешина, Л. В.* Словарь авторских новообразований в контексте современной отечественной лексикографии : автореф. дис. … д-ра филол. наук : 10.02.01 / Орлов. гос. ун-т. – Орел, 2002. – 42 с.
3. *Басава, Г. І.* Аўтарскія неалагізмы / Г. І. Басава, М. Р. Прыгодзіч // Род. слова. – 1995. – № 8. – С. 61–64.
4. *Басава, Г. І.* Аўтарскія неалагізмы / Г. І. Басава, М. Р. Прыгодзіч // Род. слова. – 1995. – № 10. – С. 68–73.
5. *Басава, Г. І.* Аўтарскія неалагізмы / Г. І. Басава, М. Р. Прыгодзіч // Род. слова. – 1995. – № 12. – С. 62–65.
6. *Лопатин, В. В.* Рождение слова: неологизмы и окказиональные образования / В. В. Лопатин. – М. : Наука, 1973. – 152 с.
7. *Прыгодзіч, М. Р.* Аўтарская неалагізацыя ў беларускай мове : дапаможнік / М. Р. Прыгодзіч. – Мінск : БДУ, 2021. – 175 с.
8. *Солахаў, А. В.* Выданне слоўнікаў індывідуальна-аўтарскіх (аказіянальных) слоў як надзённая задача беларускай лексікаграфіі / А. В. Солахаў // Сучасныя праблемы беларускай лексікалогіі і лексікаграфіі : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 19–20 ліст. 2005 г. / Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа НАН Беларусі. – Мінск, 2006. – С. 266–271.
9. *Фельдман, Н. И.* Окказиональные слова и лексикография / Н. И. Фельдман // Вопросы языкознания – 1957. – № 4. – С. 64–73.
10. *Шеляховская, Л. А.* Словообразовательный аспект изучения некоторых групп окказионализмов / Л. А. Шеляховская, Н. А. Богданов // Новые слова и словари новых слов ; отв. ред. Н. З. Котелова. – Л., 1983. – С. 82–92.


*У. П. Саўко (Беларусь)*

# ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ ПА МЕТОДЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў СІСТЭМЕ ПРАФЕСІЙНА-МЕТАДЫЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ-ФІЛОЛАГАЎ

У сістэме прафесійна-метадычнай падрыхтоўкі настаўніка-славесніка вялікая роля адводзіцца методыцы выкладання беларускай мовы. Як профільная вучэбная дысцыпліна, яна забяспечвае тэарэтычную і практычную падрыхтоўку

студэнтаў да самастойнай прафесійна-педагагічнай дзейнасці ў якасці настаўніка беларускай мовы і літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

Па методыцы выкладання беларускай мовы вучэбным планам прадугледжаны лекцыі, практычныя заняткі, кіруемая самастойная работа студэнтаў. Практычныя заняткі – гэта форма вучэбных заняткаў, на якіх выкладчык арганізуе дэталёвы разгляд студэнтамі асобных тэарэтычных палажэнняў вучэбнай дысцыпліны і фарміруе ўменні іх практычнага выкарыстання ў працэсе выканання студэнтамі адпаведных заданняў. Пералік тэм практычных заняткаў вызначаны ў вучэбнай праграме па вучэбнай дысцыпліне.

Практычныя заняткі па методыцы выкладання беларускай мовы арыентаваны ў першую чаргу на ўзнаўленне і пашырэнне ведаў, атрыманых студэнтамі на лекцыях ці ў выніку самастойнага вывучэння пэўных тэм, а таксама на авалоданне методыкай работы з навуковым і вучэбным матэрыялам і тыповымі для дысцыпліны практычнымі ўменнямі. Для эфектыўнага правядзення практычных заняткаў неабходна, каб студэнты былі папярэдне азнаёмлены са зместам канкрэтнага раздзела курса лекцый, з тэорыяй, практычным выкарыстаннем якой ім неабходна будзе авалодаць.

Найбольш частотнымі відамі практычных заняткаў па методыцы выкладання беларускай мовы з’яўляюцца тэматычныя практычныя заняткі, прысвечаныя вывучэнню раздзелаў курса беларускай мовы, мадэляванне фрагментаў урока ці цэлага ўрока, аналіз нарматыўных дакументаў, кейс-практыкі і інш.

Тэматычныя практычныя заняткі, прысвечаныя вывучэнню раздзелаў курса беларускай мовы, дазваляюць студэнтам глыбей пазнаёміцца з асаблівасцямі выкладання таго ці іншага раздзела. Напрыклад, пры вывучэнні раздзела «Методыка вывучэння марфалогіі» студэнты ўзнаўляюць веды пра асноўныя этапы і прыватнаметадычныя прынцыпы навучання марфалогіі, метады арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў пры вывучэнні розных часцін мовы, вучацца падбіраць практыкаванні ў залежнасці ад уменняў, якія неабходна сфарміраваць у вучняў, і інш.

Асноўнымі структурнымі кампанентамі такіх практычных заняткаў могуць быць:

1) паведамленне тэмы і мэты заняткаў;
2) узнаўленне тэарэтычнага матэрыялу па тэме, якая разглядаецца;
3) фарміраванне вучэбна-метадычных уменняў;
4) падвядзенне вынікаў заняткаў;
5) дамашняе заданне на наступныя практычныя заняткі.

Для узнаўлення тэарэтычнага матэрыялу па тэме, якая разглядаецца, можа выкарыстоўвацца вуснае ці пісьмовае апытванне. Вуснае апытванне можа быць індывідуальным, франтальным, камбінаваным. Яно дае магчымасць не толькі пракантраляваць, але і сістэматызаваць, паглыбіць веды студэнтаў, развіць уменне выступаць перад аўдыторыяй і інш. Падчас пісьмовага апытвання студэнты адказваюць на прапанаваныя ім пытанні. Пісьмовае апытванне дае магчымасць выявіць ступень засваення праграмнага матэрыялу ўсімі студэнтамі адначасова.

З мэтай фарміравання прафесійна-метадычных уменняў студэнтам прапануюцца розныя заданні, напрыклад: прааналізаваць змест праграмы ці падручніка па пэўных раздзелах; выканаць практыкаванні са школьнага падручніка і вызначыць, на фарміраванне якіх уменняў яны накіраваныя; распрацаваць фрагмент урока, улічваючы прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфалогіі, і інш. На гэтым этапе можа выкарыстоўвацца прагляд відэафрагмента ўрока па пэўнай тэме. Прагляд відэафрагмента дазваляе фарміраваць у студэнтаў уменне крытычна ставіцца да ўбачанага, заўважаць станоўчыя і адмоўныя моманты ў правядзенні ўрока, аналізаваць эфектыўнасць абраных метадаў і прыёмаў работы і інш.

Мадэляванне фрагментаў урока ці цэлага ўрока – від практычных заняткаў, на якім у студэнтаў фарміруюцца ўменні пісаць канспекты ўрокаў па беларускай мове, праводзіць і аналізаваць гэтыя ўрокі. Такія практычныя заняткі эфектыўна праводзіць па тэмах «Метады і прыёмы навучання беларускай мове» і «Сучасны ўрок беларускай мовы: тыпы і структура».Тут таксама прысутнічае падрыхтоўчы пазаўдыторны этап: студэнты ў якасці дамашняй работы пішуць разгорнуты канспект урока ці фрагментаў урока.

Такія практычныя заняткі могуць складацца з наступных структурных кампанентаў:

1. Паведамленне тэмы, пастаноўка мэт практычных заняткаў.

Выкладчык знаёміць студэнтаў з тэмай і мэтамі практычных заняткаў, прыкладнай схемай аналізу ўрока беларускай мовы.

2. Правядзенне студэнтам урока беларускай мовы ці фрагментаў урока беларускай мовы.

Падчас правядзення ўрока ці яго фрагментаў аднымі студэнтамі астатнія студэнты выступаюць у якасці вучняў.

3. Аналіз урока ці фрагментаў урока.

Ацэньваецца лінгвістычная і метадычная падрыхтаванасць студэнта, звяртаецца ўвага на афармленне дошкі, выкарыстанне метадычнага забеспячэння, абмяркоўваюцца правільнасць вызначэння мэт урока, эфектыўнасць форм, спосабаў, метадаў і прыёмаў, якія выкарыстоўваў студэнт, вызначаецца адпаведнасць структурных кампанентаў урока яго тыпу і інш.

Кожны студэнт можа выказаць сваё меркаванне адносна праведзенага ўрока, прапанаваць варыянты правядзення, калі гэта неабходна. Абавязкова звяртаецца ўвага на ўсе станоўчыя бакі праведзенага ўрока. У аналізе ўрокаў таксама ўдзельнічае выкладчык. Пры выяўленні пэўных недахопаў прапануюцца альтэрнатыўныя формы рашэння, знаходзяцца шляхі выхаду з узнікшай сітуацыі.

4. Падвядзенне вынікаў практычных заняткаў.

5. Інфармацыя пра дамашняе заданне.

Практычныя заняткі, на якіх адбываецца аналіз нарматыўных дакументаў, маюць на мэце знаёмства студэнтаў з нарматыўнымі дакументамі, веданне якіх неабходна для будучай прафесійнай дзейнасці ва ўстановах агульнай

сярэдняй адукацыі, і фарміраванне ўменняў карыстацца гэтымі дакументамі ў навучальнай дзейнасці. Для аналізу звычайна прапануюцца наступныя нарматыўныя дакументы:

1. Вучэбныя праграмы па беларускай мове для 5–11 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі;
2. Метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі;
3. Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па беларускай мове;
4. Вучэбныя праграмы факультатыўных заняткаў.

Да такіх практычных заняткаў выкладчык загадзя дае студэнтам спасылкі на тэксты дакументаў ці самі тэксты дакументаў (часцей за ўсё ў электронным выглядзе), якія будуць абмеркаваны на практычных занятках. Студэнты павінны дома пазнаёміцца з гэтымі дакументамі.

Структура такіх практычных заняткаў можа быць наступная:

1. Паведамленне тэмы, пастаноўка мэт практычных заняткаў.
2. Аналіз нарматыўных дакументаў.

Аналізуюцца структура і змест нарматыўных дакументаў, звяртаецца ўвага на самыя важныя моманты.

3. Фарміраванне ўменняў карыстацца нарматыўнымі дакументамі ў навучальнай дзейнасці.

На гэтым этапе студэнтам прапануюцца розныя практычныя заданні. Напрыклад, пасля аналізу норм ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па беларускай мове [2] і «Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення...» [1] даецца заданне праверыць пісьмовыя работы вучняў і ацаніць іх у адпаведнасці з патрабаваннямі вышэйназваных нарматыўных дакументаў.

4. Падвядзенне вынікаў практычных заняткаў.
5. Інфармацыя пра дамашняе заданне.

Кейс-практыкі – такі спосаб правядзення практычных заняткаў, калі студэнтам прапануецца для аналізу рэальная альбо максімальна набліжаная да рэальнай сітуацыя. Пры гэтым выбар праблемы адбываецца не адвольна, а з мэтай актывізацыі пэўнага комплексу ведаў, якія павінны быць засвоены ў працэсе вырашэння задачы. Характэрна, што кейс-задача не мае адназначнага адказу, яна толькі тэстуе здольнасць студэнтаў да аналізу і хуткага пошуку вырашэння праблемы.

Кейс-практыкі складаюцца з наступных структурных кампанентаў:

1. Індывідуальная самастойная праца студэнтаў з матэрыяламі кейса: ідэнтыфікацыя праблемы, фармуляванне ключавых альтэрнатыў, прапанова рашэння або рэкамендуемага дзеяння;
2. Праца ў малых групах па ўзгадненні бачання ключавой праблемы і яе рашэнняў;
3. Прэзентацыя і экспертыза вынікаў работы малых груп.

Такім чынам, практычныя заняткі па методыцы выкладання беларускай мовы садзейнічаюць развіццю навыкаў самападрыхтоўкі, прафесійна-метадычных уменняў, творчых здольнасцей будучых настаўнікаў беларускай мовы.

## Літаратура


1. Метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі [Электронны рэсурс]. – 2022. – Рэжым доступу: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2022-2023-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2022-2023/3781-metodicheskie-rekomendatsii.html. – Дата доступу: 10.09.2022.
2. Методические указания по организации контроля и оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам при освоении содержания образовательных программ общего среднего образования, применению норм оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам [Электронный ресурс]. – 2022. – Режим доступа: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2022-2023-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2022-2023/304-uchebnyepredmety-v-xi-klassy-2022-2023/3798-belaruskaya-mova.html. – Дата доступа: 15.09.2022.



*А. Д. Свецянкоў, Л. Г. Клімовіч (Беларусь)*


# «А КЛАСІК – НІЧОГА НЕ АДЧУВАЕ, БО ЁН – БРОНЗАВЫ»: СКУЛЬПТУРНЫЯ ПОМНІКІ Г. МІНСКА І ПАЭЗІЯ МАКСІМА ТАНКА

Сучасны Мінск упрыгожвае вялікая колькасць помнікаў, мемарыялаў, стэл і абеліскаў, бюстаў, мемарыяльных дошак, месцаў ушанавання дзеячаў нацыянальнай гісторыі і культуры.

У Беларусі скульптура як від мастацтва атрымлівае вялікае развіццё ў XIX – пачатку XX ст. У 1930-я гады скульптары Андрэй Бембель, Міхаіл Керзін, Заір Азгур, Аляксей Глебаў, Аляксандр Арлоў афармляюць Дом урада ў Мінску партрэтамі і тэматычнымі рэльефамі. Скульптурамі былі ўпрыгожаны Дом Чырвонай Арміі, Оперны тэатр, Палац піянераў.

У пасляваенныя гады ў скульптуры пераважала ваенная тэматыка, услаўляўся подзвіг народа, з'яўляліся партрэты абаронцаў Радзімы, Герояў Савецкага Саюза.